і інш.). У бел. л-ры пач. 20 ст. творы Д.л. ўваходзілі ў спец. зборнікі-чытанкі («Першае чытанне для дзетак беларусаў» Цёткі, 1906, і «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Я.Коласа, 1909). Да Д.л. адносяцца нарыс У.Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі» (1977), кнігі В.Вольскага («На бабровых азёрах», 1957; «Падарожжа па краіне беларусаў», 1968 і інш.). *В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**ДЫДАКТЫ́ЧНАЯ ЛІТАРАТУ́РА**, творы мастацкай літаратуры розных родаў і жанраў, аб'яднаныя навуч. і выхаваўчымі мэтамі. Рысы Д.л. выразна заўважаліся ў дыдактычна-хрысціянскіх словах Кірылы Тураўскага (12 ст.) і Грыгорыя Цамблака (мяжа 14—15 ст). Аднак найб. гарманічна навуч. і выхаваўчая мэты Д.л. спалучыліся ў прадмовах да кніг Старога Запавету Ф.Скарыны. Звяртаючыся да ўсіх саслоўяў ВКЛ, бел. першадрукар меў на мэце не толькі пазнаёміць чытачоў з тэкстамі Святога Пісання (выхаваць хрысціяніна), але і запаліць у іх сэрцах святло свецкай навукі. Адна з істотных рыс Д.л. — зварот да дзяцей і юнацтва — адлюстравана ў дыярыушы Ф.Еўлашоўскага. Надзвычай моцна ўстаноўка на выхаванне, паведамленне новых звестак праявілася ў творчасці паэта-асветніка Сімяона Полацкага («Стихи утешнии к лицу единому»